КАНВЕНЦЫЯ
аб правах людзей
з інваліднасцю

Прынята рэзалюцыяй 61/106
Генеральнай Асамблеі
ад 13 снежня 2006 года

Мінск
2014

Канвенцыя аб правах людзей з інваліднасцю

Прэамбула

Дзяржавы-ўдзельніцы гэтай Канвенцыі,

a) *нагадваючы* аб прынцыпах, абвешчаных у Статуце Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, згодна з якімі ўласцівыя кожнаму чалавеку годнасць і каштоўнасць, а таксама роўныя і неад'емныя правы ўсіх членаў чалавечай сям'і прызнаюцца асновай свабоды, справядлівасці і міру ў сусвеце;

b) прызнаючы, што Арганізацыя Аб'яднаных Нацый ва Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і Міжнародных пактах аб правах чалавека, абвесціла і пастанавіла, што кожнаму належаць замацаваныя ў іх правы і свабоды, без якога б там ні было адрознення;

c) сцвярждаючы ўніверсальнасць, непадзельнасць, ўзаемазалежнасць і ўзаемазвязанасць ўсіх правоў чалавека і асноўных свабод, а таксама неабходнасць гарантаваць людзям з інваліднасцю карыстанне імі ў поўнай меры і без дыскрымінацыі;

d) *спасылаючыся* на Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах, Міжнародную канвенцыю аб ліквідацыі ўсіх форм расавай дыскрымінацыі, Канвенцыю аб ліквідацыі ўсіх форм дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын, Канвенцыю супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных ці прыніжаючых годнасць відаў абыхождання і пакарання, Канвенцыю аб правах дзіцяці і Міжнародную канвенцыю аб абароне правоў усіх працоўных-мігрантаў і членаў іх сям'і;

e) *прызнаючы*, што паняцце інваліднасці змяняецца і што інваліднасць вынікае з узаемадзеяння паміж асобамі, якія маюць парушэнні здароўя, і адносінавымі і асяродкавымі бар'ерамі, якое замінае іх поўнаму і эфектыўнаму ўдзелу ў жыцці грамадства нароўні з іншымі;

f) *прызнаючы* важнасць прынцыпаў і праграмных рэкамендацый, якія змяшчаюцца ў Сусветнай праграме дзеянняў ў дачыненні да людзей з інваліднасцю і ў Стандартных правілах па забеспячэнні роўных магчымасцяў для людзей з інваліднасцю, для ўплыву на пашырэнне, фармуляванне і ацэнку стратэгій,

планаў, праграм і мерапрыемстваў на нацыянальным, рэгіянальным і міжнародным узроўнях з мэтай далейшага забеспячэння роўных магчымасцяў для людзей з інваліднасцю;

g) *падкрэсліваючы* важнасць актуалізацыі пытанняў інваліднасці як неад'емнага складніка адпаведных стратэгій устойлівага развіцця;

h) *прымаючы пад увагу таксама*, што дыскрымінацыя любой асобы на падставе інваліднасці ёсць парушэннем уласцівых кожнаму чалавеку годнасці і каштоўнасці;

i) *прызнаючы далей* разнастайнасць людзей з інваліднасцю;

j) *прызнаючы* неабходнасць падтрымліваць і абараняць правы чалавека ўсіх людзей з інваліднасцю, у тым ліку тых, хто патрабуе больш актыўнай падтрымкі;

k) *заклапочаныя тым*, што нягледзячы на гэтыя розныя дакументы і прынятыя меры, людзі з інваліднасцю працягваюць сутыкацца з бар'ерамі, якія перашкаджаюць іх удзелу ў жыцці грамадства нароўні з іншымі, і парушэннямі іх правоў чалавека ва ўсіх частках свету;

l) *прызнаючы* важнасць міжнароднага супрацоўніцтва для паляпшэння ўмоў жыцця людзей з інваліднасцю ў кожнай краіне, асабліва ў краінах, якія развіваюцца;

m) *прызнаючы* каштоўны цяперашні і патэнцыйны ўклад людзей з інваліднасцю ў агульны дабрабыт і разнастайнасць іх мясцовых супольнасцяў, а таксама тое, што садзейнічанне поўнаму ажыццяўленню людзьмі з інваліднасцю правоў чалавека і асноўных свабод, а таксама паўнавартаснаму ўдзелу людзей з інваліднасцю дазволіць умацаваць іх адчуванне далучанасці і дасягнуць істотнага прагрэсу ў чалавечым, сацыяльным і эканамічным развіцці грамадства і выкараненне галечы;

n) *прызнаючы* важнасць для людзей з інваліднасцю іх асабістай самастойнасці і незалежнасці, у тым ліку свабоды рабіць уласны выбар;

o) *прымаючы* пад увагу, што людзі з інваліднасцю павінны мець магчымасць актыўна ўдзельнічаць у працэсах прыняцця рашэнняў аб стратэгіях і праграмах, у тым ліку тых, якія тычацца іх непасрэдна;

p) *заклапочаныя* складанымі ўмовамі, у якіх знаходзяцца людзі з інваліднасцю, якія падвяргаюцца

ююцца множным альбо абвостраным формам дыскрымінацыі па прыкмеце расы, колеру скуры, пола, мовы, веравызнання, палітычных альбо іншых поглядаў, нацыянальнага, этнічнага, абарыгеннага ці сацыяльнага паходжання, маёмаснага становічша, нараджэння альбо іншага статусу;

q) *прызнаючы*, што жанчыны і дзяўчаты з інваліднасцю як дома, так і па-за домам часцей могуць стаць ахвярамі гвалту, траўмавання ці здзеку, недагляду, зняважлівага або неналежнага абыхождання ці эксплуатацыі;

r) *прызнаючы*, што дзеці з інваліднасцю павінны мець магчымаць поўнага ажыццяўлення правоў чалавека і асноўных свабод нароўні з іншымі дзецьмі, а таксама ўзгадваючы звязаныя з гэтым абавязацельствы, прынятыя дзяржавамі-ўдзельніцамі Канвенцыі аб правах дзіцяці;

s) *падкрэсліваючы* неабходнасць уліку гендэрных аспектаў ва ўсіх намаганнях па садзейнічанні поўнаму ажыццяўленню правоў чалавека і асноўных свабод людзьмі з інваліднасцю;

t) *падкрэсліваючы* той факт, што большасць людзей з інваліднасцю жывуць ва ўмовах беднасці, і ў сувязі

з гэтым прызнаючы крытычную неабходнасць прымаць меры па зніжэнні адмоўнага ўплыву беднасці на людзей з інваліднасцю;

u) *прымаючы пад увагу*, што абстаноўка міру і бяспекі, заснаваная на поўнай павазе замацаваных у Статуце Арганізацыі Аб'яднаных Нацый мэтаў і прынцыпаў і выкананні адпаведных пагадненняў у сферы правоў чалавека, з'яўляецца абавязковай умовай поўнай абароны людзей з інваліднасцю, асабліва падчас узброеных канфліктаў і замежнай акупацыі,

v) *прызнаючы* важнасць даступнасці фізічнага, сацыяльнага, эканамічнага і культурнага асяроддзя, аховы здароўя і адукацыі, а таксама інфармацыі і камунікацыі для надзялення людзей з інваліднасцю магчымасцю поўнага ажыццяўлення правоў чалавека і асноўных свабод;

w) *усведамляючы*, што кожны чалавек, маючы абавязкі перад іншымі людзьмі і перад супольнасцю, да якой ён ці яна належыць, павінен садзейнічаць падтрымцы і захаванню правоў чалавека, замацаваных у Міжнародным білі аб правах чалавека;

х) *перакананыя*, што сям'я ёсць натуральнай і асноўнай ячэйкай грамадства і мае права на абарону з боку грамадства і дзяржавы, і што людзі з інваліднасцю і члены іх сям'і павінны атрымліваць неабходную абарону і падтрымку, якія дазволяць сем'ям рабіць свой унёсак у справу поўнага і роўнага ажыццяўлення правоў людзей з інваліднасцю;

у) *перакананыя*, што ўсебаковая і цэласная міжнародная канвенцыя аб заахвочванні і абароне правоў і годнасці людзей з інваліднасцю стане важным унёскам у выпраўленне глыбока неспрыяльнага сацыяльнага становішча людзей з інваліднасцю і пашырэнне іх удзелу ў грамадзянскім, палітычным, эканамічным, сацыяльным і культурным жыцці пры роўных магчымасцях, як у развітых краінах, так і ў краінах, якія развіваюцца;

пагадзіліся аб наступным:

Артыкул 1. Мэта

Мэтай дадзенай Канвенцыі з'яўляецца падтрымка, абарона і забеспячэнне поўнага і роўнага ажыццяўлення ўсімі людзьмі з інваліднасцю правоў чалавека і асноўных свабод, а таксама забеспячэнне павагі да ўласцівай ім годнасці.

Да людзей з інваліднасцю належаць асобы з устойлівымі фізічнымі, псіхічнымі, інтэлектуальнымі альбо сэнсарнымі парушэннямі, якія пры ўзаемадзеянні з рознымі бар'ерамі могуць перашкаджаць іх поўнаму і эфектыўнаму ўдзелу ў жыцці грамадства нароўні з іншымі.

Артыкул 2. Азначэнні

Для мэтаў гэтай Канвенцыі:

«с*камунікацыя*» ўключае выкарыстанне моў, тэкстаў, азбукі Брайля, тактыльнай камунікацыі, буйнога шрыфта, даступных мультымедыйных і друкаваных сродкаў, а таксама аудыёматэрыялаў, сродкаў звычайнай мовы, начытвання, узмацняльных і альтэрнатыўных метадаў, сродкаў і фарматаў зносін, у тым ліку даступнай інфармацыйна-камунікатыўнай тэхналогіі;

«*мова*» ўключае вербальную мову, мову жэстаў і іншыя формы невербальных моў;

«*дыскрымінацыя на падставе інваліднасці*» азначае любое адрозненне, выключэнне альбо абмежаванне з прычыны інваліднасці, мэтай ці вынікам

якога з'яўляецца прыніжэнне ці адмаўленне прызнання, рэалізацыі ці ажыццяўлення нароўні з іншымі ўсіх правоў чалавека і асноўных свабод у палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай, грамадзянскай ці любой іншай сферы. Сюды належаць усе формы дыскрымінацыі, у тым ліку адмова ў належным прыстасаванні;

«*належнае прыстасаванне*» азначае неабходныя і адпаведныя патрэбам мадыфікацыі і карэктывы, якія не з'яўляюцца неапраўданым альбо празмерным цяжарам і якія прымяняюцца па патрэбе ў канкрэтнай сітуацыі для забеспячэння рэалізацыі ці ажыццяўлення людзьмі з інваліднасцю нароўні з іншымі ўсіх правоў чалавека і асноўных свабод;

«*універсальны дызайн*» азначае дызайн прадуктаў, асяроддзя, праграм і паслуг, які робіць іх прыдатнымі для выкарыстання ўсімі людзьмі ў найбольшай ступені без патрэбы адаптацыі альбо спецыяльнага дызайну. «Універсальны дызайн» не выключае дапаможныя прыстасаванні для канкрэтных груп людзей з інваліднасцю там, дзе гэта патрэбна.

Артыкул 3. Агульныя прынцыпы

Агульнымі прынцыпамі гэтай Канвенцыі з'яўляюцца:

a) павага да ўласцівай чалавеку годнасці, яго асабістай самастойнасці, у тым ліку свабоды рабіць свой уласны выбар, і незалежнасці;

b) недыскрымінацыя;

c) поўны і эфектыўны ўдзел і ўключанасць у грамадства;

d) павага да асаблівасцяў людзей з інваліднасцю і прыняцце іх як складніка чалавечай разнастайнасці і часткі чалавецтва;

e) роўнасць магчымасцяў;

f) даступнасць;

g) роўнасць паміж мужчынамі і жанчынамі;

h) павага да здольнасцяў, якія развіваюцца ў дзяцей з інваліднасцю, і павага да права дзяцей з інваліднасцю захоўваць сваю індывідуальнасць.

Артыкул 4. Агульныя абавязкі

1. Дзяржавы-ўдзельніцы бяруць на сябе абавязак забяспечваць і падтрымліваць поўную рэалізацыю ўсіх правоў чалавека і асноўных свабод усімі людзьмі з інваліднасцю без аніякай дыскрымінацыі на пад-

ставе інваліднасці. З гэтай мэтай дзяржавы-ўдзельніцы абавязваюцца:

a) прымаць усе адпаведныя заканадаўчыя, адміністрацыйныя і іншыя меры для ажыццяўлення правоў, прызнаных гэтай Канвенцыяй;

b) прымаць усе адпаведныя меры, у тым ліку заканадаўчыя, для змянення ці адмены існуючых законаў, пастаноў, звычаяў і практык, якія з'яўляюцца дыскрымінацыйнымі ў адносінах да людзей з інваліднасцю;

c) улічваць абарону і падтрымку правоў людзей з інваліднасцю ва ўсіх стратэгіях і праграмах;

d) устрымлівацца ад любых дзеянняў альбо метадаў, якія супярэчаць гэтай Канвенцыі, і ствараць умовы, каб усе дзяржаўныя органы і ўстановы дзейнічалі ў адпаведнасці з гэтай Канвенцыяй;

e) прымаць усе адпаведныя меры, каб ліквідаваць дыскрымінацыю на падставе інваліднасці з боку любой асобы, арганізацыі альбо прыватнага прадпрыемства;

f) праводзіць ці спрыяць правядзенню даследаванняў і канструктарскай распрацоўкі прадуктаў, паслуг,

абсталявання і аб'ектаў універсальнага дызайну (згодна з азначэннем, дадзеным у Артыкуле 2 гэтай Канвенцыі), якія б патрабавалі мінімальнай адаптацыі і найменшых выдаткаў для прыстасавання да асаблівых патрэбаў інваліда, спрыяць іх даступнасці і выкарыстанню, а таксама пашыраць ідэю ўніверсальнага дызайну пры распрацоўцы стандартаў і рэкамендацый.

g) даследаваць ці спрыяць правядзенню даследаванняў і канструктарскай распрацоўкі, а таксама садзейнічаць даступнасці і выкарыстанню новых тэхналогій, у тым ліку інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, дапаможных сродкаў для палягчэння мабільнасці, прыстасаванняў і дапаможных тэхналогій, прыдатных для людзей з інваліднасцю, з наданнем асаблівай увагі даступным па кошце тэхналогіям;

h) забяспечваць людзей з інваліднасцю даступнай інфармацыяй аб дапаможных сродках для палягчэння мабільнасці, прыстасаваннях і дапаможных тэхналогіях, у тым ліку новых тэхналогіях, а таксама іншых формах падтрымкі, дапаможных паслугах і аб'ектах;

i) спрыяць навучанню спецыялістаў і персанала якія працуюць з людзьмі з інваліднасцю, аб правах, прызнаных у гэтай Канвенцыі, з мэтай паляпшаць якасць дапамогі і паслуг, гарантаваных такімі правамі.

2. Што датычыць эканамічных, сацыяльных і культурных правоў, кожная дзяржава-ўдзельніца бярэ на сябе абавязак прымаць меры з прыцягненнем максімальных з наяўных рэсурсаў і, пры неабходнасці, звяртаючыся да міжнароднага супрацоўніцтва, дзеля паступовага дасягнення поўнай рэалізацыі гэтых правоў без абмежаванняў тых замацаваных у гэтай Канвенцыі абавязкаў, якія падлягаюць непасрэднаму прымяненню згодна з міжнародным правам.

3. Пры распрацоўцы і прымяненні заканадаўства і стратэгій, накіраваных на рэалізацыю гэтай Канвенцыі, а таксама ў іншых працэсах прыняцця рашэнняў па пытаннях, якія датычаць людзей з інваліднасцю, дзяржавы-ўдзельніцы абавязуюцца кансультавацца і дзейнічаць у шчыльным кантакце з людзьмі з інваліднасцю, у тым ліку з дзецьмі з інваліднасцю, і актыўна супрацоўнічаць з арганізацыямі, якія прадстаўляюць іх інтарэсы.

4. Нішто ў гэтай Канвенцыі не закранае аніякіх палажэнняў, якія ў большай ступені спрыяюць

рэалізацыі правоў людзей з інваліднасцю і могуць утрымлівацца ў заканадаўстве дзяржавы-ўдзельніцы альбо нормах міжнароднага права, якое прымяняецца ў гэтай дзяржаве. Не дазваляецца аніякае абмежаванне альбо адыход ад любых правоў чалавека і асноўных свабод, якія прызнаюцца ці існуюць ў дзяржавах-удзельніцах гэтай Канвенцыі на падставе закона, канвенцый, пастаноў альбо звычаяў, з той прычыны, што ў гэтай Канвенцыі такія правы ці свабоды не прызнаюцца альбо прызнаюцца ў меншым аб'ёме.

5. Палажэнні гэтай Канвенцыі распаўсюджваюцца на ўсе часткі федэратыўных дзяржаў без аніякіх абмежаванняў ці выняткаў.

Артыкул 5. Роўнасць і недыскрымінацыя

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць, што ўсе асобы роўныя перад законам і згодна з ім і маюць права на роўную абарону закона і карыстанне ім без дыскрымінацыі.

2. Дзяржавы-ўдзельніцы забараняюць любую дыскрымінацыю па прыкмеце інваліднасці і гарантуюць людзям з інваліднасцю роўную і эфектыўную прававую абарону ад дыскрымінацыі па любых прыкметах.

3. У мэтах заахвочвання роўнасці і ліквідацыі дыскрымінацыі дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе неабходныя меры для забеспячэння належнага прыстасавання.

4. Канкрэтныя меры, неабходныя для паскарэння або дасягнення фактычнай роўнасці людзей з інваліднасцю, не будуць разглядацца як дыскрымінацыя ў адпаведнасці з палажэннямі гэтай Канвенцыі.

Артыкул 6. Жанчыны з інваліднасцю

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць, што жанчыны і дзяўчаты з інваліднасцю падвяргаюцца множным формам дыскрымінацыі, і ў гэтай сувязі прымаюць меры для забеспячэння поўнага і роўнага ажыццяўлення імі ўсіх правоў чалавека і асноўных свабод.

2. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе належныя меры для забеспячэння ўсебаковага развіцця, паляпшэння становішча і пашырэння правоў і магчымасцяў жанчын з тым, каб гарантаваць ім рэалізацыю і ажыццяўленне правоў чалавека і асноўных свабод, замацаваных у гэтай Канвенцыі.

Артыкул 7. Дзеці з інваліднасцю

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе неабходныя меры для забеспячэння поўнага ажыццяўлення дзецьмі з інваліднасцю ўсіх правоў чалавека і асноўных свабод нароўні з іншымі дзецьмі.

2. Ва ўсіх дзеяннях у дачыненні да дзяцей з інваліднасцю першачарговая ўвага павінна надавацца інтарэсам дзіцяці.

3. Дзяржавы-ўдзельніцы павінны забяспечыць дзецям з інваліднасцю права свабодна выказваць свае погляды па ўсіх датычных іх пытаннях, якія павінны быць разгледжаны і прыняты пад увагу адпаведна іх узросту і сталасці, нароўні з іншымі дзецьмі, і павінны быць забяспечаны дапамогай для рэалізацыі такога права, адпаведнай іх інваліднасці і ўзросту.

Артыкул 8. Асветніцка-выхаваўчая праца

1. Дзяржавы-ўдзельніцы абавязуюцца прымаць неадкладныя, эфектыўныя і належныя меры для таго, каб:

а) паляпшаць абазнанасць усяго грамадства, у тым ліку на ўзроўні сям'і, у пытаннях, якія тычацца людзей з інваліднасцю, і ўмацоўваць павагу да правоў і годнасці людзей з інваліднасцю;

b) змагацца са стэрэатыпамі, прадузятасцю і шкоднымі звычаямі ў адносінах да людзей з інваліднасцю, у тым ліку звязанымі з полам і ўзростам, ва ўсіх сферах жыцця;

c) прапагандаваць патэнцыял і ўклад, які робяць людзі з інваліднасцю.

2. Меры, якія прымаюцца з гэтай мэтай, уключаюць:

a) ініцыянаванне і правядзенне эфектыўных грамадскіх асветніцкіх кампаній, накіраваных на:

I) выхаванне ўспрымальнасці да правоў чалавека людзей з інваліднасцю;

II) заахвочванне пазітыўных уяўленняў аб людзях з інваліднасцю і лепшага разумення іх грамадствам;

III) садзейнічанне прызнанню ўменняў, моцных бакоў і здольнасцяў людзей з інваліднасцю і іх унёска на працоўным месцы і на рынку працы;

b) выхаванне на ўсіх узроўнях сістэмы адукацыі, у тым ліку ва ўсіх дзяцей з ранняга ўзросту, паважлівага стаўлення да правоў людзей з інваліднасцю;

c) заахвочванне ўсіх органаў сродкаў масавай інфармацыі да такога выяўлення людзей з інваліднасцю, якое адпавядае мэце гэтай Канвенцыі;

d) спрыянне правядзенню выхаваўчых праграм, накіраваных на павышэнне абазнанасці ў пытаннях, якія тычацца людзей з інваліднасцю і іх правоў.

Артыкул 9. Даступнасць

1. Для таго, каб зрабіць магчымымі для людзей з інваліднасцю незалежнае жыццё і поўны ўдзел ва ўсіх аспектах жыцця дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць належныя меры для забеспячэння людзям з інваліднасцю доступу нароўні з іншымі да фізічнага асяроддзя, транспарта, інфармацыі і сувязі, у тым ліку інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і сістэм, да іншых аб'ектаў і паслуг, якія з'яўляюцца адкрытымі для насельніцтва альбо прадастаўляюцца насельніцтву, як у гарадскіх, так і ў сельскіх раёнах. Гэтыя меры мусяць уключаць выяўленне і ліквідацыю перашкодаў і бар'ераў, якія замінаюць даступнасці, і павінны распаўсюджвацца, у тым ліку, на наступнае:

a) будынкі, дарогі, транспарт і іншыя ўнутраныя і знешнія аб'екты, у тым ліку школы, жылыя дамы, медыцынскія ўстановы і працоўныя месцы;

b) інфармацыйныя, камунікацыйныя і іншыя службы, у тым ліку электронныя і экстранныя службы.

2. Дзяржавы-ўдзельніцы таксама прымаюць належныя меры для таго, каб:

a) распрацоўваць мінімальныя стандарты і рэкамендацыі, якія прадугледжваюць даступнасць аб'ектаў і паслуг, якія з'яўляюцца адкрытымі для насельніцтва ці прадастаўляюцца насельніцтву, уводзіць іх у дзеянне і сачыць за іх выкананнем;

b) забяспечваць, каб прыватныя прадпрыемствы, якія прапаноўваюць аб'екты і паслугі, якія з'яўляюцца адкрытымі для насельніцтва ці прадастаўляюцца насельніцтву, улічвалі ўсе аспекты даступнасці для людзей з інваліднасцю;

c) арганізоўваць для ўсіх задзейнічаных бакоў інструктаж па праблемах даступнасці, з якімі сутыкаюцца людзі з інваліднасцю;

d) забяспечваць будынкі і іншыя аб'екты, адкрытыя для насельніцтва, знакамі, выкананымі азбукай Брайля і ў лёгкай для прачытання і разумення форме;

e) прадастаўляць розныя віды паслуг асістэнтаў і пасрэднікаў, у тым ліку праваднікоў, начытвальнікаў і прафесійных сурдаперакладчыкаў, для павышэння даступнасці будынкаў і іншых аб'ектаў, адкрытых для насельніцтва;

f) развіваць іншыя належныя формы аказання дапамогі і падтрымкі людзям з інваліднасцю для забеспячэння ім доступу да інфармацыі;

g) спрыяць доступу людзей з інваліднасцю да новых інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і сістэм, у тым ліку да інтэрнэта;

h) садзейнічаць праектаванню, распрацоўцы, вытворчасці і распаўсюджванню даступных інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, каб даступнасць такіх тэхналогій і сістэм дасягалася з мінімальнымі выдаткамі.

Артыкул 10. Права на жыццё

Дзяржавы-ўдзельніцы зноў пацвярджаюць неад'емнае права кожнага чалавека на жыццё і прымаюць ўсе неабходныя меры для забеспячэння яго эфектыўнага ажыццяўлення людзьмі з інваліднасцю нароўні з іншымі.

Артыкул 11. Сітуацыі рызыкі і надзвычайныя гуманітарныя сітуацыі

Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць згодна са сваімі абавязкамі па міжнародным праве, уключаючы міжнароднае гуманітарнае права і міжнароднае права правоў

чалавека, усе неабходныя меры для забеспячэння абароны і бяспекі людзей з інваліднасцю ў сітуацыях рызыкі, у тым ліку падчас узброеных канфліктаў, надзвычайных гуманітарных сітуацый і стыхійныйных бедстваў.

Артыкул 12. Роўнасць перад законам

1. Дзяржавы-ўдзельніцы пацвярждаюць, што кожны чалавек з інваліднасцю, дзе б ён ні знаходзіўся, мае права на роўную прававую абарону.

2. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць, што людзі з інваліднасцю маюць праваздольнасць нароўні з іншымі ва ўсіх аспектах жыцця.

3. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць належныя меры для забеспячэння людзям з інваліднасцю доступу да падтрымкі, якая можа ім спатрэбіцца для рэалізацыі сваёй праваздольнасці.

4. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць, каб усе меры, звязаныя з рэалізацыяй праваздольнасці, прадуглеждвалі належныя і эфектыўныя гарантыі прадухілення злоўжыванняў згодна з міжнародным правам правоў чалавека. Такія гарантыі павінны забяспечваць, каб меры, звязаныя з рэалізацыяй праваздольнасці, арыентаваліся на павагу правоў, волі і перавагаў асо-

бы, былі вольныя ад канфлікту інтарэсаў і неналежнага ўплыву, адпавядалі абставінам гэтай асобы і падлажваліся пад іх, прымяняліся цягам як мага меншага перыяду часу і рэгулярна правяраліся кампетэнтным, незалежным і непрадузятым органам ці судовай інстанцыяй. Гэтыя гарантыі павінны адпавядаць той ступені, у якой яны закранаюць правы і інтарэсы дадзенай асобы.

5. З улікам палажэнняў гэтага артыкула дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе належныя і эфектыўныя меры для забеспячэння роўных правоў людзей з інваліднасцю мець ва ўласнасці ці атрымліваць у спадчыну маёмасць, кантраляваць свае фінансавыя справы і мець роўны доступ да банкаўскіх пазыкаў, іпатэчных крэдытаў і іншых форм фінансавага крэдытавання і забяспечваюць, каб людзі з інваліднасцю адвольна не пазбаўляліся сваёй маёмасці.

Артыкул 13. Доступ да правасуддзя

1. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць людзям з інваліднасцю нароўні з іншымі эфектыўны доступ да правасуддзя, у тым ліку прадугледжваюць працэсуальныя і адпаведныя ўзросту карэктывы, якія палягчаюць выкананне імі сваёй эфектыўнай ролі непасрэдных і

ўскосных удзельнікаў, у тым ліку сведкаў, ва ўсіх стадыях судовага працэсу, уключаючы стадыю папярэдняга расследавання і іншыя падрыхтоўчыя этапы.

2. Каб спрыяць забеспячэнню людзям з інваліднасцю эфектыўнага доступа да правасуддзя, дзяржавы-ўдзельніцы садзейнічаюць належнаму навучанню асобаў, якія працуюць у сферы адпраўлення правасуддзя, уключаючы супрацоўнікаў праваахоўных органаў і устаноў пенітэнцыярнай сістэмы.

Артыкул 14. Свабода і недатыкальнасць асобы

1. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць, каб людзі з інваліднасцю нароўні з іншымі:

a) карысталіся правам на свабоду і недатыкальнасць асобы;

b) не пазбаўляліся волі незаконна або адвольна і каб любое пазбаўленне волі адпавядала закону, а наяўнасць інваліднасці ні ў якім разе не з'яўлялася падставай для пазбаўлення волі.

2. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць, каб у тым выпадку, калі згодна з якой-небудзь працэдурай людзі з інваліднасцю пазбаўляюцца волі, ім нароўні з іншымі прадастаўляліся гарантыі згодна з міжнародным правам правоў чалавека і каб абыходжанне з імі адпавяда-

ла мэтам і прынцыпам гэтай Канвенцыі, уключаючы забеспячэнне належнага прыстасавання.

Артыкул 15. Свабода ад катаванняў і жорсткіх, бесчалавечных або зневажальных да годнасці відаў абыходжання ці пакарання

1. Ніхто не павінен падвяргацца катаванням ці жорсткаму, бесчалавечнаму або зневажальнаму да яго годнасці абыходжанню ці пакаранню. У прыватнасці, ніхто не павінен без яго ці яе свабоднай згоды падвяргацца медыцынскім ці навуковым доследам.

2. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе эфектыўныя заканадаўчыя, адміністратыўныя, судовыя ці іншыя меры для таго, каб людзі з інваліднасцю нароўні з іншымі не падвяргаліся катаванням ці жорсткаму, бесчалавечнаму або зневажальнаму да годнасці абыходжанню ці пакаранню.

Артыкул 16. Свабода ад эксплуатацыі, гвалту і здзеку

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе належныя заканадаўчыя, адміністрацыйныя, сацыяльныя, адукацыйныя і іншыя меры для абароны людзей з

інваліднасцю як дома, так і па-за яго межамі ад усіх форм эксплуатацыі, гвалту і здзеку, у тым ліку ад іх гендэрна вызначаных аспектаў.

2. Дзяржавы-ўдзельніцы таксама прымаюць усе належныя меры для прадухілення ўсіх форм эксплуатацыі, гвалту і здзеку, забяспечваючы, у прыватнасці, належныя формы аказання дапамогі і падтрымкі, з улікам узроставай і гендэрнай спецыфікі, людзям з інваліднасцю , іх сем'ям і асобам, якія даглядаюць за людзьмі з інваліднасцю, у тым ліку шляхам прадастаўлення інфармацыі і навучання аб тым, як пазбягаць праяваў эксплуатацыі, гвалту і здзеку, выяўляць іх і паведамляць пра іх. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць, каб паслугі па прадастаўленні абароны аказваліся з улікам узроставай і гендэрнай спецыфікі і фактара інваліднасці.

3. З мэтай прадухілення праяў усіх форм эксплуатацыі, гвалту і здзеку, дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць, каб усе ўстановы і праграмы, прызначаныя для абслугоўвання людзей з інваліднасцю, знаходзіліся пад эфектыўным наглядам з боку незалежных органаў.

4. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе належныя меры для садзейнічання фізічнаму, кагнітыўнаму і псіхалагічнаму аднаўленню, рэабілітацыі і сацыяль-

най рэінтэграцыі людзей з інваліднасцю, якія сталі ахвярамі любой формы эксплуатацыі, гвалту ці здзеку, у тым ліку шляхам аказання паслуг па прадастаўленні абароны. Такія аднаўленне і рэінтэграцыя павінны адбывацца ва ўмовах, якія спрыяюць умацаванню здароўя, дабрабыту, самапавагі, годнасці і самастойнасці асобы, і ажыццяўляцца з улікам патрэбаў, абумоўленых узроставай і гендэрнай спецыфікай.

5. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць эфектыўныя заканадаўства і стратэгіі, у тым ліку, арыентаваныя на дзяцей і жанчын, для забеспячэння таго, каб выпадкі эксплуатацыі, гвалту і здзеку ў дачыненні да людзей з інваліднасцю падлягалі выяўленню, расследаванню, і ў належных выпадках пераследу.

Артыкул 17. Абарона асабістай цэласнасці

Кожны чалавек з інваліднасцю мае права на павагу яго ці яе фізічнай і псіхічнай цэласнасці нароўні з іншымі.

Артыкул 18. Свабода перамяшчэння і грамадзянства

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць правы людзей з інваліднасцю на свабоду перамяшчэння, на свабоду

выбара месца жыхарства і на грамадзянства нароўні з іншымі, у тым ліку шляхам забеспячэння таго, каб людзі з інваліднасцю:

a) мелі права набываць і змяняць грамадзянства і не пазбаўляліся свайго грамадзянства адвольна або па прычыне інваліднасці;

b) не пазбаўляліся, па прычыне інваліднасці, магчымасці атрымліваць дакументы, якія пацвярджаюць іх грамадзянства, ці іншыя дакументы, якія сведчаць іх асобу, валодаць і карыстацца такімі дакументамі альбо выкарыстоўваць адпаведныя працэдуры, напрыклад іміграцыйныя, якія могуць быць неабходныя для палягчэння рэалізацыі права на свабоду перамяшчэння;

c) мелі права свабодна пакідаць любую краіну, уключаючы сваю ўласную;

d) не пазбаўляліся адвольна або па прычыне інваліднасці права на ўезд у сваю ўласную краіну.

2. Дзеці з інваліднасцю рэгіструюцца адразу пасля нараджэння і з моманту нараджэння маюць права на імя і на набыццё грамадзянства, а таксама, у найбольш магчымай ступені, права ведаць сваіх бацькоў і права на іх клопат.

Артыкул 19. Самастойны лад жыцця і ўключанасць у мясцовую супольнасць

Дзяржавы-ўдзельніцы гэтай Канвенцыі прызнаюць роўнае права ўсіх людзей з інваліднасцю жыць у звычайных месцах пражывання, пры роўных з іншымі людзьмі магчымасцях выбару, і прымаюць эфектыўныя і належныя меры для таго, каб садзейнічаць поўнай рэалізацыі людзьмі з інваліднасцю гэтага права і іх поўнаму ўключэнню і ўдзелу ў жыцці мясцовай супольнасці, у тым ліку забяспечваючы, каб:

a) людзі з інваліднасцю мелі магчымасць нароўні з іншымі выбіраць сваё месца жыхарства і тое, дзе і з кім пражываць, і не былі абавязаны пражываць у нейкіх пэўных жыллёвых умовах;

b) людзі з інваліднасцю мелі доступ да розных дапаможных паслуг, якія аказваюцца надомна, па месцы жыхарства ці на базе мясцовай супольнасці, уключаючы персанальную дапамогу, неабходную для падтрымкі пражывання ў мясцовай супольнасці і ўключэння ў яе жыццё, а таксама для прадухілення ізаляцыі ці сегрэгацыі ад мясцовай супольнасці;

c) паслугі і аб'екты калектыўнага карыстання, прызначаныя для ўсяго насельніцтва, былі ў роўнай ступені даступныя для людзей з інваліднасцю і адпавядалі іх патрэбам.

Артыкул 20. Індывідуальная мабільнасць

Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць эфектыўныя меры для забеспячэння індывідуальнай мабільнасці людзей з інваліднасцю з максімальна магчымай ступенню іх самастойнасці, у тым ліку шляхам:

a) садзейнічання індывідуальнай мабільнасці людзей з інваліднасцю абраным імі спосабам, у абраны імі час і па даступным кошце;

b) палягчэння доступу людзей з інваліднасцю да якасных сродкаў для палягчэння мабільнасці, прыладаў, дапаможных тэхналогій і паслуг асістэнтаў і пасрэднікаў, у тым ліку забяспечваючы іх даступны кошт;

c) навучання людзей з інваліднасцю і спецыялістаў, якія працуюць з імі, навыкам мабільнасці;

d) заахвочвання прадпрыемстваў, якія вырабляюць сродкі для палягчэння мабільнасці, прыладаў і дапаможных тэхналогій, да ўліку ўсіх аспектаў мабільнасці людзей з інваліднасцю.

Артыкул 21. Свабода выказвання поглядаў і перакананняў і доступ да інфармацыі

Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе належныя меры для забеспячэння таго, каб людзі з інваліднасцю маглі карыстацца правам на свабоду выказвання поглядаў і перакананняў, уключаючы свабоду шукаць, атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю і ідэі нароўні з іншымі, карыстаючыся па сваім выбары ўсімі формамі камунікацыі, названымі ў артыкуле 2 гэтай Канвенцыі, уключаючы:

a) забеспячэнне людзей з інваліднасцю інфармацыяй, прызначанай для шырокай публікі, у даступных фарматах і з выкарыстаннем тэхналогій, якія ўлічваюць розныя формы інваліднасці, своечасова і без дадатковай платы;

b) прыняцце і садзейнічанне выкарыстанню ў афіцыйных зносінах мовы жэстаў, азбукі Брайля, узмацняльнай і альтэрнатыўнай камунікацыі і ўсіх іншых даступных сродкаў, метадаў і фарматаў зносін па выбары людзей з інваліднасцю;

c) актыўнае заахвочванне прыватных прадпрыемстваў, якія аказваюць паслугі шырокай публіцы, у тым ліку праз інтэрнэт, да прадастаўлення інфармацыі і

паслуг у даступных і прыдатных для людзей з інваліднасцю фарматах;

d) заахвочванне сродкаў масавай інфармацыі, уключаючы тых, якія прадастаўляюць інфармацыю праз інтэрнэт, да таго, каб яны рабілі свае паслугі даступнымі для людзей з інваліднасцю;

e) прызнанне і заахвочванне выкарыстання моў жэстаў.

Артыкул 22. Недатыкальнасць прыватнага жыцця

1. Незалежна ад месца жыхарства ці жыллёвых умоў ні адна асоба з інваліднасцю не павінна падвяргацца адвольнаму або незаконнаму пасягальніцтву на недатыкальнасць яго ці яе прыватнага жыцця, сям'і, жылля ці карэспандэнцыі і іншых відаў камунікацыі або незаконным нападкам на яго ці яе гонар і рэпутацыю. Людзі з інваліднасцю маюць права на абарону закона ад такіх пасягальніцтваў ці нападак.

2. Дзяржавы-ўдзельніцы абараняюць канфідэнцыйнасць звестак пра асобу, стан здароўя і рэабілітацыю людзей з інваліднасцю нароўні з іншымі.

Артыкул 23. Павага да дома і сям'і

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць эфектыўныя і належныя меры для ліквідацыі дыскрымінацыі

ў адносінах да людзей з інваліднасцю ва ўсіх сферах, датычных шлюбу, сям'і, бацькоўства і асабістых узаемаадносінаў, нароўні з іншымі, з мэтай забяспечыць, каб:

a) прызнавалася права ўсіх людзей з інваліднасцю, якія дасягнулі шлюбнага ўзросту, браць шлюб і ствараць сям'ю на аснове свабоднай і поўнай згоды тых, хто бярэ шлюб;

b) прызнаваліся правы людзей з інваліднасцю на свабоднае і адказнае прыняцце рашэнняў аб колькасці дзяцей і інтэрвалах паміж іх нараджэннем, на доступ да адпаведнай узросту інфармацыі і адукацыі па пытаннях рэпрадуктыўнага здароўя і планавання сям'і, а таксама прадастаўляліся сродкі, неабходныя для ажыццяўлення імі такіх правоў;

c) людзі з інваліднасцю, у тым ліку дзеці, нароўні з іншымі, захоўвалі сваю фертыльнасць.

2. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць правы і абавязкі людзей з інваліднасцю ў дачыненні да апякунства, папячыцельства, апекі, усынаўлення дзяцей або аналагічных інстытутаў, калі такія паняцці існуюць у нацыянальным заканадаўстве; ва ўсіх выпадках першаснае значэнне надаецца інтарэсам

дзіцяці. Дзяржавы-ўдзельніцы аказваюць людзям з інваліднасцю належную дапамогу ў выкананні імі сваіх абавязкаў па выхаванні дзяцей.

3. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць, каб дзеці з інваліднасцю мелі роўныя правы ў адносінах да сямейнага жыцця. Для рэалізацыі гэтых правоў і недапушчэння ўтойвання дзяцей з інваліднасцю, іх пакідання, ухілення ад дагляду за імі і іх сегрэгацыі дзяржавы-ўдзельніцы абавязваюцца з самага пачатку забяспечваць дзяцей з інваліднасцю і іх сем'і ўсебаковай інфармацыяй, паслугамі і падтрымкай.

4. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць, каб дзіця не разлучалася са сваімі бацькамі супраць іх волі, за выключэннем выпадкаў, калі паднаглядныя суду кампетэнтныя органы ў адпаведнасці з прымянімымі законамі і працэдурамі вызначаюць, што такое разлучэнне неабходна ў найлепшых інтарэсах дзіцяці. Ні пры якіх абставінах дзіця не можа быць разлучанае з бацькамі па прычыне інваліднасці альбо самога дзіцяці, альбо аднаго ці абодвух бацькоў.

5. Дзяржавы-ўдзельніцы абавязваюцца ў выпадку, калі бліжэйшыя сваякі не могуць забяспечыць дагляд

за дзіцём з інваліднасцю, прыкладаць усе намаганні для таго, каб арганізаваць альтэрнатыўны дагляд праз прыцягненне больш далёкіх сваякоў, а пры адсутнасці такой магчымасці – за кошт стварэння сямейных умоў для пражывання дзіцяці ў мясцовай супольнасці.

Артыкул 24. Адукацыя

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць права людзей з інваліднасцю на адукацыю. З мэтай рэалізацыі гэтага права без дыскрымінацыі і на падставе роўных магчымасцяў дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць інклюзіўную адукацыю на ўсіх узроўнях і навучанне на працягу ўсяго жыцця, імкнучыся пры гэтым:

a) да поўнага развіцця чалавечага патэнцыялу, а таксама пачуцця годнасці і самапавагі і да ўзмацнення павагі да правоў чалавека, асноўных свабод і чалавечай разнастайнасці;

b) да развіцця асобы, талентаў і творчасці людзей з інваліднасцю, а таксама іх разумовых і фізічных здольнасцяў у самым поўным аб'ёме;

c) да надзялення людзей з інваліднасцю магчымасцю эфектыўна ўдзельнічаць у жыцці свабоднага грамадства.

2. Пры рэалізацыі гэтага права дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць, каб:

a) людзі з інваліднасцю не выключаліся з сістэмы агульнай адукацыі па прычыне інваліднасці, а дзеці з інваліднасцю – з сістэмы бясплатнай і абавязковай пачатковай адукацыі ці сярэдняй адукацыі;

b) людзі з інваліднасцю мелі нароўні з іншымі доступ да інклюзіўнай, якаснай і бясплатнай пачатковай адукацыі і сярэдняй адукацыі ў месцах свайго пражывання;

c) забяспечвалася належнае прыстасаванне, якое ўлічвае індывідуальныя патрэбы;

d) людзі з інваліднасцю атрымлівалі ў межах сістэмы агульнай адукацыі падтрымку, неабходную для палягчэння іх эфектыўнага навучання;

e) у абстаноўцы, якая максімальна спрыяе засваенню ведаў і сацыяльнаму развіццю, згодна з мэтай поўнай інклюзіі, прымаліся эфектыўныя меры па арганізацыі індывідуалізаванай падтрымкі.

3. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць людзям з інваліднасцю магчымасць засвойваць жыццёвыя і сацыялізацыйныя навыкі, каб палегчыць іх поўны і роўны ўдзел у працэсе адукацыі і ў якасці членаў мяс-

цовай супольнасці. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць у гэтым накірунку належныя меры, у тым ліку:

a) садзейнічаюць засваенню азбукі Брайля, альтэрнатыўных шрыфтоў, узмацняльных і альтэрнатыўных метадаў, спосабаў і фарматаў зносін, а таксама навыкаў арыентацыі і мабільнасці і спрыяюць падтрымцы з боку аднагодкаў і настаўніцтву;

b) садзейнічаюць засваенню мовы жэстаў і заахвочванню моўнай самабытнасці глухіх;

c) забяспечваюць, каб навучанне асоб, у прыватнасці дзяцей, якія з'яўляюцца сляпымі, глухімі або слепаглухімі, ажыццяўлялася з дапамогай найбольш адпаведных для індывіда моў, метадаў і спосабаў зносін і ў становішчы, якое максімальным чынам спрыяе засваенню ведаў і сацыяльнаму развіццю.

4. Каб садзейнічаць забеспячэнню рэалізацыі гэтага права, дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць належныя меры для прыцягнення на працу настаўнікаў, у тым ліку настаўнікаў з інваліднасцю, якія валодаюць мовай жэстаў і/або азбукай Брайля, і для навучання спецыялістаў і персанала, якія працуюць на ўсіх узроўнях сістэмы адукацыі. Такое навучанне павінна

уключаць асвету па пытаннях інваліднасці і выкарыстання адпаведных узмацняльных і альтэрнатыўных метадаў, спосабаў і фарматаў зносін, навучальных методык і матэрыялаў для аказання падтрымкі людзям з інваліднасцю.

5. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць, каб людзі з інваліднасцю маглі мець доступ да вышэйшай адукацыі, прафесійнага навучання, адукацыі для дарослых і навучання на працягу ўсяго жыцця без дыскрымінацыі і нароўні з іншымі. З гэтай мэтай дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць меры, каб для людзей з інваліднасцю было забяспечана належнае прыстасаванне.

Артыкул 25. Здароўе

Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць, што людзі з інваліднасцю маюць права на найвышэйшы дасягальны ўзровень здароўя без дыскрымінацыі па прыкмеце інваліднасці. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе належныя меры для забеспячэння доступу людзей з інваліднасцю да паслуг у сферы аховы здароўя, якія ўлічваюць гендэрную спецыфіку, у тым ліку да рэабілітацыі па стане здароўя. У прыватнасці, дзяржавы-ўдзельніцы:

a) забяспечваюць людзям з інваліднасцю такі ж набор, якасць і ўзровень бясплатных або недарагіх паслуг і праграм па ахове здароўя, што і іншым асобам, у тым ліку ў галіне сэксуальнага і рэпрадуктыўнага здароўя і ў межах прапанаваных насельніцтву дзяржаўных праграм аховы здароўя;

b) аказваюць такія паслугі ў сферы аховы здароўя, якія патрэбны людзям з інваліднасцю непасрэдна па прычыне іх інваліднасці, уключаючы раннюю дыягностыку, а ў належных выпадках – карэкцыю і паслугі, накіраваныя на мінімізацыю і прадухіленне далейшага ўзнікнення інваліднасці, у тым ліку сярод дзяцей і людзей сталага веку;

c) арганізуюць такія паслугі ў сферы аховы здароўя як мага бліжэй да месцаў непасрэднага пражывання гэтых людзей, у тым ліку ў сельскіх раёнах;

d) патрабуюць, каб спецыялісты аховы здароўя прадастаўлялі людзям з інваліднасцю паслугі той жа якасці, што і іншым асобам, у тым ліку на аснове свабоднай і інфармаванай згоды шляхам, сярод іншага, павышэння дасведчанасці аб правах чалавека, годнасці, самастойнасці і патрэбах людзей з інваліднасцю праз навучанне і прыняцце этычных

стандартаў для дзяржаўнай і прыватнай сістэмы аховы здароўя;

e) забараняюць дыскрымінацыю ў дачыненні да людзей з інваліднасцю пры забеспячэнні медыцынскага страхавання і страхавання жыцця, калі апошняе дазваляецца нацыянальным правам, і прадугледжваюць, што яно прадастаўляецца справядлівым і належным чынам;

f) не дапускаюць дыскрымінацыйнай адмовы ў ахове здароўя або паслугах у гэтай галіне альбо атрыманні ежы ці вадкасцяў па прычыне інваліднасці.

Артыкул 26. Абілітацыя і рэабілітацыя

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць, у тым ліку пры падтрымцы з боку іншых людзей з інваліднасцю, эфектыўныя і належныя меры для таго, каб надзяліць людзей з інваліднасцю магчымасцю для дасягнення і захавання максімальнай незалежнасці, поўных фізічных, разумовых, сацыяльных і прафесійных здольнасцяў, поўнага ўключэння і ўдзелу ва ўсіх аспектах жыцця. З гэтай мэтай дзяржавы-ўдзельніцы арганізуюць, умацоўваюць і пашыраюць комплексныя абілітацыйныя і рэабілітацыйныя паслугі і праграмы,

асабліва ў сферы аховы здароўя, занятасці, адукацыі і сацыяльнага абслугоўвання, такім чынам, каб гэтыя паслугі і праграмы:

a) пачыналі рэалізоўвацца як мага раней і былі заснаваныя на шматпрофільнай ацэнцы патрэб і моцных бакоў індывіда;

b) спрыялі ўдзелу і ўключэнню ў мясцовую супольнасць і ва ўсе аспекты жыцця грамадства, мелі добраахвотны характар і былі даступныя для людзей з інваліднасцю як мага бліжэй да месцаў іх пражывання, у тым ліку ў сельскіх раёнах.

2. Дзяржавы-ўдзельніцы заахвочваюць развіццё пачатковага і далейшага навучання спецыялістаў і персаналу, якія працуюць у сферы абілітацыйных і рэабілітацыйных паслуг.

3. Дзяржавы-ўдзельніцы заахвочваюць наяўнасць, веданне і выкарыстанне прызначаных для людзей з інваліднасцю дапаможных прыстасаванняў і тэхналогій, якія адносяцца да абілітацыі і рэабілітацыі.

Артыкул 27. Праца і занятасць

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць права людзей з інваліднасцю на працу нароўні з іншымі; яно

ўключае права мець магчымасць зарабляць сабе на жыццё працай, якую чалавек з інваліднасцю свабодна абраў або на якую ён свабодна пагадзіўся, ва ўмовах, калі рынак працы і вытворчае асяроддзе з'яўляюцца адкрытымі, інклюзіўнымі і даступнымі для людзей з інваліднасцю. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць і заахвочваюць рэалізацыю права на працу, у тым ліку тымі асобамі, якія атрымліваюць інваліднасць падчас працоўнай дзейнасці, шляхам прыняцця, у тым ліку ў заканадаўчым парадку, належных мер, накіраваных, у прыватнасці, на наступнае:

a) забарона дыскрымінацыі па прыкмеце інваліднасці адносна ўсіх пытанняў, якія тычацца ўсіх формаў занятасці, уключаючы ўмовы прыёму на працу, найму і занятасці, захавання працы, прасоўвання па службе, бяспечных і здаровых умоў працы;

b) абарона правоў людзей з інваліднасцю нароўні з іншымі на справядлівыя і спрыяльныя ўмовы працы, у тым ліку роўныя магчымасці і роўную плату за працу роўнай вартасці, бяспечныя і здаровыя ўмовы працы, уключаючы абарону ад дамаганняў, і задавальненне скаргаў;

c) забеспячэнне таго, каб людзі з інваліднасцю маглі ажыццяўляць свае працоўныя і прафсаюзныя правы нароўні з іншымі;

d) забеспячэнне для людзей з інваліднасцю магчымасці эфектыўнага доступу да агульных праграм тэхнічнай і прафесійнай арыентацыі, служб працаўладкавання і прафесійнага і бесперапыннага навучання;

e) пашырэнне на рынку працы магчымасцяў для працаўладкавання людзей з інваліднасцю і іх прасоўвання па службе, а таксама аказанне дапамогі ў пошуку, атрыманні, захаванні і аднаўленні працы;

f) пашырэнне магчымасцяў для індывідуальнай працоўнай дзейнасці, прадпрымальніцтва, развіцця кааператываў і арганізацыі ўласнай справы;

g) наём людзей з інваліднасцю ў дзяржаўным сектары;

h) стымуляванне найму людзей з інваліднасцю ў прыватным сектары з дапамогай належных стратэгій і мер, якія могуць уключаць праграмы пазітыўных дзеянняў, стымулы і іншыя меры;

i) забеспячэнне людзям з інваліднасцю належнага прыстасавання працоўнага месца;

j) заахвочванне набыцця людзьмі з інваліднасцю працоўнага досведу ва ўмовах адкрытага рынку працы;

k) заахвочванне праграм прафесійнай і кваліфікацыйнай рэабілітацыі, захавання працоўных месцаў і вяртання на працу для людзей з інваліднасцю.

2. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць, каб людзі з інваліднасцю не ўтрымліваліся ў рабстве або ў падняволным стане і былі абароненыя нароўні з іншымі ад прымусовай або абавязковай працы.

Артыкул 28. Дастатковы жыццёвы ўзровень і сацыяльная абарона

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць права людзей з інваліднасцю на дастатковы жыццёвы ўзровень для сябе і сваёй сям'і, у тым ліку на дастатковае харчаванне, адзенне і жыллё, і на бесперапыннае паляпшэнне ўмоў жыцця і прымаюць належныя меры для забеспячэння і заахвочвання рэалізацыі гэтага права без дыскрымінацыі па прыкмеце інваліднасці.

2. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць права людзей з інваліднасцю на сацыяльную абарону і на карыстанне гэтым правам без дыскрымінацыі па прыкмеце інваліднасці і прымаюць належныя меры для забес-

пячэння і заахвочвання рэалізацыі гэтага права, уключаючы меры:

a) па забеспячэнні людзям з інваліднасцю роўнага доступу да чыстай вады і па забеспячэнні доступу да належных і недарагіх паслуг, прыстасаванняў і іншай дапамогі для задавальнення патрэбаў, звязаных з інваліднасцю;

b) па забеспячэнні доступу людзям з інваліднасцю, асабліва жанчынам і дзяўчатам з інваліднасцю і людзям сталага веку з інваліднасцю, да праграм сацыяльнай абароны і праграм скарачэння маштабаў галечы;

c) па забеспячэнні людзям з інваліднасцю і іх сем'ям, якія жывуць ва ўмовах галечы, доступу да дапамогі з боку дзяржавы для пакрыцця звязаных з інваліднасцю выдаткаў, уключаючы належнае навучанне, кансультаванне, фінансавую дапамогу і часовы патранажны дагляд;

d) па забеспячэнні людзям з інваліднасцю доступу да праграм дзяржаўнага жылля;

e) па забеспячэнні роўнага доступу людзям з інваліднасцю да пенсіённых выплат і праграм.

Артыкул 29. Удзел у палітычным і грамадскім жыцці

Дзяржавы-ўдзельніцы гарантуюць людзям з інваліднасцю палітычныя правы і магчымасць карыстацца імі нароўні з іншымі і прымаюць абавязак:

а) забяспечваць, каб людзі з інваліднасцю маглі эфектыўна і ўсебакова ўдзельнічаць, непасрэдна або праз свабодна абраных прадстаўнікоў, у палітычным і грамадскім жыцці нароўні з іншымі, у тым ліку мелі права і магчымасць галасаваць і быць абранымі, у прыватнасці праз:

I) забеспячэнне таго, каб працэдуры, памяшканні і матэрыялы для галасавання былі прыдатнымі, даступнымі і лёгкімі для разумення і выкарыстання;

II) абарону права людзей з інваліднасцю на ўдзел у таемным галасаванні на выбарах і публічных рэферэндумах без запалохвання і на вылучэнне сваіх кандыдатур для выбараў, права фактычна займаць пасады і выконваць ўсе публічныя функцыі на ўсіх узроўнях дзяржаўнай улады – падтрымліваючы выкарыстанне дапаможных і новых тэхналогій, дзе гэта дарэчы;

III) гарантаванне свабоднага волевыяўлення людзей з інваліднасцю як выбаршчыкаў і з гэтай мэ-

тай – праз задавальненне, калі гэта неабходна, іх просьб аб аказанні дапамогі пры галасаванні якой-небудзь асобай па іх выбары;

b) актыўна спрыяць стварэнню абстаноўкі, у якой людзі з інваліднасцю маглі б эфектыўна і ўсебакова ўдзельнічаць у кіраванні дзяржаўнымі справамі без дыскрымінацыі і нароўні з іншымі, і заахвочваць іх удзел у дзяржаўных справах, у тым ліку:

I) удзел у няўрадавых арганізацыях і аб'яднаннях, праца якіх звязана з дзяржаўным і палітычным жыццём краіны, у тым ліку ў дзейнасці палітычных партый і кіраўніцтве імі;

II) стварэнне арганізацый людзей з інваліднасцю і ўступленне ў іх з тым, каб прадстаўляць людзей з інваліднасцю на міжнародным, нацыянальным, рэгіянальным і мясцовым узроўнях.

Артыкул 30. Удзел у культурным жыцці, правядзенні вольнага часу, адпачынку і занятку спортам

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць права людзей з інваліднасцю ўдзельнічаць нароўні з іншымі ў культурным жыцці і прымаюць усе належныя меры для забеспячэння таго, каб людзі з інваліднасцю:

a) мелі доступ да твораў культуры ў даступных фарматах;

b) мелі доступ да тэлевізійных праграм, фільмаў, тэатру і іншых культурных мерапрыемстваў у даступных фарматах;

c) мелі доступ да такіх месцаў культурных мерапрыемстваў або паслуг, як тэатры, музеі, кінатэатры, бібліятэкі і турыстычныя паслугі, а таксама мелі ў найбольш магчымай ступені доступ да помнікаў і аб'ектаў, якія маюць нацыянальную культурную значнасць.

2. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць належныя меры для таго, каб надзяліць людзей з інваліднасцю магчымасцю развіваць і выкарыстоўваць свой творчы, мастацкі і інтэлектуальны патэнцыял – не толькі для сваёй карысці, але і дзеля ўзбагачэння ўсяго грамадства.

3. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць у адпаведнасці з міжнародным правам усе належныя меры для забеспячэння таго, каб законы аб абароне правоў інтэлектуальнай уласнасці не станавіліся неапраўданым або дыскрымінацыйным бар'ерам для доступу людзей з інваліднасцю да твораў культуры.

4. Людзі з інваліднасцю маюць права нароўні з іншымі на прызнанне і падтрымку іх асаблівай культурнай і моўнай самабытнасці, уключаючы жэставую мову і культуру глухіх.

5. Каб надзяліць людзей з інваліднасцю магчымасцю ўдзельнічаць нароўні з іншымі ў спартыўных мерапрыемствах і ў правядзенні вольнага часу і адпачынку, дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць належныя меры:

a) для заахвочвання і прапаганды як мага больш поўнага ўдзелу людзей з інваліднасцю ў агульнапрофільных спартыўных мерапрыемствах на ўсіх узроўнях;

b) для забеспячэння таго, каб людзі з інваліднасцю мелі магчымасць арганізоўваць спартыўныя і забаўляльныя мерапрыемствы адмыслова для людзей з інваліднасцю, развіваць іх і ўдзельнічаць у іх, а таксама для садзейнічання ў гэтай сувязі таму, каб ім нароўні з іншымі забяспечваліся належныя навучанне, падрыхтоўка і рэсурсы;

c) для забеспячэння таго, каб людзі з інваліднасцю мелі доступ да спартыўных, рэкрэацыйных і турыстычных аб'ектаў;

d) для забеспячэння таго, каб дзеці з інваліднасцю мелі роўны з іншымі дзецьмі доступ да ўдзелу ў

гульнях, спартыўных мерапрыемствах, правядзенні вольнага часу і адпачынку, уключаючы мерапрыемствы ў межах школьнай сістэмы;

e) для забеспячэння таго, каб людзі з інваліднасцю мелі доступ да паслуг тых, хто займаецца арганізацыяй вольнага часу, турызму, адпачынку і спартыўных мерапрыемстваў.

Артыкул 31. Статыстыка і збор дадзеных

1. Дзяржавы-ўдзельніцы абавязваюцца ажыццяўляць збор належнай інфармацыі, у тым ліку статыстычных і даследчых дадзеных, якая дазваляе ім распрацоўваць і ажыццяўляць стратэгіі ў мэтах выканання гэтай Канвенцыі. У працэсе збору і захоўвання такой інфармацыі неабходна:

a) выконваць юрыдычна замацаваныя гарантыі, у тым ліку заканадаўства аб абароне дадзеных, каб забяспечыць канфідэнцыяльнасць і недатыкальнасць прыватнага жыцця людзей з інваліднасцю;

b) выконваць міжнародна прызнаныя нормы, якія тычацца абароны правоў чалавека і асноўных свабод, а таксама этычныя прынцыпы пры зборы і выкарыстанні статыстычных дадзеных.

2. Сабраная ў адпаведнасці з гэтым артыкулам інфармацыя дэзагрэгуецца адпаведным чынам і выкарыстоўваецца для садзейнічання ацэнцы таго, як дзяржавы-ўдзельніцы выконваюць свае абавязацельствы па гэтай Канвенцыі, а таксама для выяўлення і ліквідацыі бар'ераў, з якімі людзі з інваліднасцю сутыкаюцца пры ажыццяўленні сваіх правоў.

3. Дзяржавы-ўдзельніцы бяруць на сябе адказнасць за распаўсюд такіх статыстычных дадзеных і забяспечваюць іх даступнасць для людзей з інваліднасцю і іншых асоб.

Артыкул 32. Міжнароднае супрацоўніцтва

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць важнасць міжнароднага супрацоўніцтва і яго заахвочвання для падтрымкі нацыянальных намаганняў па рэалізацыі мэты і задач гэтай Канвенцыі і прымаюць у сувязі з гэтым належныя і эфектыўныя меры на міждзяржаўным узроўні, а дзе гэта дарэчы – у партнёрстве з адпаведнымі міжнароднымі і рэгіянальнымі арганізацыямі і грамадзянскай супольнасцю, у прыватнасці з арганізацыямі людзей з інваліднасцю. Такія меры могуць, акрамя іншага, уключаць:

a) забеспячэнне таго, каб міжнароднае супрацоўніцтва, у тым ліку міжнародныя праграмы развіцця, ахоплівала людзей з інваліднасцю і было для іх даступна;

b) палягчэнне і падтрымку ўмацавання наяўных магчымасцяў, у тым ліку шляхам узаемнага абмену інфармацыяй, досведам, праграмамі і перадавымі напрацоўкамі;

c) садзейнічанне супрацоўніцтву ўсферы даследаванняў і доступу да навукова-тэхнічных ведаў;

d) прадастаўленне, дзе гэта дарэчы, тэхніка-эканамічнай дапамогі, у тым ліку шляхам палягчэння доступу да даступных і дапаможных тэхналогій і шляхам ўзаемнага абмену імі, а таксама праз перадачу тэхналогій.

2. Палажэнні гэтага артыкула не закранаюць абавязкаў кожнай дзяржавы-ўдзельніцы па выкананні сваіх абавязацельстваў згодна з гэтай Канвенцыяй.

Артыкул 33. Нацыянальная імплементацыя і маніторынг

1. Дзяржавы-ўдзельніцы згодна са сваім арганізацыйным ладам прызначаюць ва ўрадзе адну або

некалькі інстанцый, якія курыруюць пытанні, звязаныя з рэалізацыяй гэтай Канвенцыі, і належным чынам вывучаюць магчымасць стварэння або прызначэння ва ўрадзе каардынацыйнага механізма для садзейнічання адпаведнай працы ў розных сектарах і на розных узроўнях.

2. Дзяржавы-ўдзельніцы згодна са сваім прававым і адміністрацыйным ладам падтрымліваюць, умацоўваюць, прызначаюць або ствараюць у сябе структуру, якая ўключае, дзе гэта дарэчы, адзін або некалькі незалежных механізмаў для заахвочвання, абароны і маніторынгу рэалізацыі гэтай Канвенцыі. Пры прызначэнні або стварэнні такога механізма дзяржавы-ўдзельніцы бяруць пад увагу прынцыпы, датычныя статусу і функцыянавання нацыянальных установ, якія займаюцца абаронай і заахвочваннем правоў чалавека.

3. Грамадзянская супольнасць, асабліва людзі з інваліднасцю і арганізацыі, якія іх прадстаўляюць, у поўным аб'ёме ўключаюцца ў працэс маніторынгу і ўдзельнічаюць у ім.

Артыкул 34. Камітэт па правах людзей з інваліднасцю

1. Засноўваецца Камітэт па правах людзей з інваліднасцю (называны далей «Камітэт»), які выконвае функцыі, прадугледжаныя ніжэй.

2. На момант уваходжання гэтай Канвенцыі ў сілу Камітэт складаецца з дванаццаці экспертаў. Пасля яшчэ шасцідзесяці ратыфікацый Канвенцыі або далучэнняў да яе членскі склад Камітэта павялічваецца на шэсць чалавек, дасягаючы максімуму - васемнаццаці членаў.

3. Члены Камітэта выступаюць у асабістай якасці і валодаюць высокімі маральнымі якасцямі і прызнанай кампетэнтнасцю і досведам у сферы, якую ахоплівае дадзеная Канвенцыя. Пры вылучэнні сваіх кандыдатаў дзяржавам-удзельніцам прапануецца належным чынам улічваць палажэнне, сфармуляванае ў пункце 3 артыкула 4 гэтай Канвенцыі.

4. Члены Камітэта абіраюцца дзяржавамі-ўдзельніцамі, пры гэты надаецца ўвага справядліваму геаграфічнаму размеркаванню, прадстаўленасці розных форм цывілізацыі і асноўных прававых сістэм, збалансаванай прадстаўленасці полаў і ўдзелу экспертаў з інваліднасцю.

5. Члены Камітэта абіраюцца тайным галасаваннем са спіса кандыдатаў, вылучаных дзяржавамі-удзельніцамі з ліку сваіх грамадзян, на пасяджэннях Канферэнцыі дзяржаў-удзельніц. На гэтых пасяджэннях, на якіх дзве траціны дзяржаў-удзельніц складаюць кворум, абранымі ў склад Камітэта з'яўляюцца тыя кандыдаты, якія атрымалі найбольшую колькасць галасоў і абсалютную большасць галасоў прадстаўнікоў дзяржаў-удзельніц, якія прысутнічалі і ўдзельнічалі ў галасаванні.

6. Першапачатковыя выбары праводзяцца не пазней чым праз шэсць месяцаў са дня ўваходжання ў сілу дадзенай Канвенцыі. Не менш чым за чатыры месяцы да даты кожных выбараў Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый накіроўвае дзяржавам-удзельніцам ліст з прапановай прадставіць кандыдатуры на працягу двух месяцаў. Пасля гэтага Генеральны сакратар складае ў алфавітным парадку спіс усіх вылучаных такім чынам кандыдатаў з указаннем дзяржаў-удзельніц, якія іх вылучылі, і накіроўвае яго дзяржавам-удзельніцам гэтай Канвенцыі.

7. Члены Камітэта абіраюцца на чатыры гады. Яны маюць права быць пераабранымі толькі адзін

раз. Аднак тэрмін паўнамоцтваў шасці з членаў, якія абіраюцца на першых выбарах, сканчаецца ў канцы двухгадовага перыяду; неадкладна пасля першых выбараў імёны гэтых шасці членаў вызначаюцца па жэрабі старшынёй на пасяджэнні, аб якім гаворыцца ў пункце 5 гэтага артыкула.

8. Абранне шасці дадатковых членаў Камітэта прымяркоўваецца да звычайных выбараў, якія рэгулююцца адпаведнымі палажэннямі гэтага артыкула.

9. Калі які-небудзь член Камітэта памірае або сыходзіць у адстаўку або аб'яўляе, што не ў стане больш выконваць свае абавязкі па якой-небудзь іншай прычыне, дзяржава-ўдзельніца, якая высунула кандыдатуру гэтага члена, на астатні тэрмін паўнамоцтваў прызначае іншага эксперта, які валодае кваліфікацыяй і адпавядае патрабаванням, якія прадугледжаны ў адпаведных палажэннях гэтага артыкула.

10. Камітэт вызначае свае ўласныя правілы працэдуры.

11. Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый прадастаўляе неабходны персанал і матэрыяльныя сродкі для эфектыўнага ажыццяўлення Камітэтам сваіх функцый у адпаведнасці з дадзенай Канвенцыяй і склікае яго першую нараду.

12. Члены Камітэта, заснаванага ў адпаведнасці з гэтай Канвенцыяй, атрымліваюць узнагароджанне, зацвярджанае Генеральнай Асамблеяй Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, са сродкаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у парадку і на ўмовах, якія вызначаюцца Асамблеяй з улікам важнасці абавязкаў Камітэта.

13. Члены Камітэта маюць права на льготы, прывілеі і імунітэты экспертаў у камандзіроўках па справах Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, замацаваныя ў адпаведных раздзелах Канвенцыі аб прывілеях і імунітэтах Аб'яднаных Нацый.

Артыкул 35. Даклады дзяржаў-удзельніц

1. Кожная дзяржава-ўдзельніца падае ў Камітэт праз Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый усеабдымны даклад аб мерах, прынятых для ажыццяўлення сваіх абавязацельстваў па гэтай Канвенцыі, і аб прагрэсе, дасягнутым у гэтым накірунку, на працягу двух гадоў пасля ўваходжання гэтай Канвенцыі ў сілу для адпаведнай дзяржавы-ўдзельніцы.

2. Пасля гэтага дзяржавы-ўдзельніцы падаюць наступныя даклады не радзей чым раз у чатыры гады, а таксама тады, калі аб гэтым просіць Камітэт.

3. Камітэт вызначае кіруючыя прынцыпы, якія акрэсліваюць змест дакладаў.

4. Дзяржаве-ўдзельніцы, якая падала ў Камітэт усёабдымны першапачатковы даклад, няма неабходнасці паўтараць у сваіх наступных дакладах раней пададзеную інфармацыю. Дзяржавам-удзельніцам прапануецца падумаць над тым, каб рабіць падрыхтоўку дакладаў у Камітэт адкрытым і транспарэнтным працэсам, і належным чынам улічваць палажэнне, сфармуляванае ў пункце 3 артыкула 4 гэтай Канвенцыі.

5. Даклады могуць уключаць інфармацыю аб фактарах і цяжкасцях, якія ўплываюць на ступень выканання абавязацельстваў па гэтай Канвенцыі.

Артыкул 36. Разгляд дакладаў

1. Камітэт разглядае кожны даклад і фармулюе па ім прапановы і агульныя рэкамендацыі, якія ён лічыць належнымі, і накіроўвае іх адпаведнай дзяржаве-ўдзельніцы. Дзяржава-ўдзельніца можа накіраваць у адказ любую інфармацыю па сваім выбары. Камітэт можа запытваць у дзяржаў-удзельніц дадатковую інфармацыю, якая мае дачыненне да рэалізацыі гэтай Канвенцыі.

2. Калі дзяржава-ўдзельніца істотна спазняецца з падачай даклада, Камітэт можа інфармаваць адпаведную дзяржаву-ўдзельніцу аб неабходнасці разгляду пытання рэалізацыі Канвенцыі ў такой дзяржаве-ўдзельніцы на падставе дакладнай інфармацыі, якой валодае Камітэт, калі цягам трох месяцаў пасля такога паведамлення не будзе пададзены адпаведны даклад. Камітэт прапануе адпаведнай дзяржаве-ўдзельніцы ўзяць удзел у такім разглядзе. Калі дзяржава-ўдзельніца ў адказ падае адпаведны даклад, прымяняюцца палажэнні пункта 1 гэтага артыкула.

3. Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый перадае даклады ў распараджэнне ўсіх дзяржаў-удзельніц.

4. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць шырокі доступ да сваіх дакладаў для грамадскасці ў сваёй краіне і палягчаюць азнаямленне з прапановамі і агульнымі рэкамендацыямі, якія тычацца гэтых дакладаў.

5. Калі Камітэт лічыць гэта патрэбным, ён накіроўвае даклады дзяржаў-удзельніц у спецыялізаваныя установы, фонды і праграмы Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, а таксама ў іншыя кампетэнтныя органы, для таго,

каб яны прынялі меры ў адказ на просьбу аб тэхнічнай кансультацыі або дапамозе альбо ўказанне на патрэбу ў іх, разам з заўвагамі і рэкамендацыямі Камітэта (калі такія ёсць) адносна такіх просьбаў ці ўказанняў.

Артыкул 37. Супрацоўніцтва паміж дзяржавамі-ўдзельніцамі і Камітэтам

1. Кожная дзяржава-ўдзельніца супрацоўнічае з Камітэтам і аказвае яго членам садзейнічанне ў выкананні імі свайго мандата.

2. У сваіх адносінах з дзяржавамі-ўдзельніцамі Камітэт належным чынам улічвае шляхі і сродкі нарошчвання нацыянальных магчымасцяў па рэалізацыі гэтай Канвенцыі, у тым ліку з дапамогай міжнароднага супрацоўніцтва.

Артыкул 38. Адносіны Камітэта з іншымі органамі

Для садзейнічання эфектыўнай рэалізацыі гэтай Канвенцыі і заахвочвання міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы, якую яна ахоплівае:

а) спецыялізаваныя ўстановы і іншыя органы Арганізацыі Аб'яднаных Нацый маюць права быць прадстаўленымі пры разглядзе пытання аб ажыц-

цяўленні такіх палажэнняў гэтай Канвенцыі, якія падпадаюць пад іх мандат. Калі Камітэт лічыць гэта патрэбным, ён можа прапаноўваць спецыялізаваным установам і іншым кампетэнтным органам даць экспертнае заключэнне адносна ажыццяўлення Канвенцыі ў сферах, якія падпадаюць пад іх адпаведныя мандаты. Камітэт можа прапаноўваць спецыялізаваным установам і іншым органам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый прадставіць даклады аб ажыццяўленні Канвенцыі ў сферах, якія адносяцца да іх дзейнасці;

i) пры выкананні свайго мандата Камітэт кансультуецца, калі гэта дарэчы, з іншымі адпаведнымі органамі, заснаванымі на падставе міжнародных дагавораў па правах чалавека, для таго, каб забяспечваць узгодненасць іх адпаведных кіруючых прынцыпаў прадстаўлення дакладаў, а таксама прапановаў і агульных рэкамендацый і пазбягаць дубліравання і паралелізму пры ажыццяўленні імі сваіх функцый.

Артыкул 39. Даклад Камітэта

Камітэт раз у два гады прадастаўляе Генеральнай Асамблеі і Эканамічнаму і Сацыяльнаму Савету да-

клад аб сваёй дзейнасці і можа выносіць прапановы і агульныя рэкамендацыі па выніках разгляду атрыманых ад дзяржаў-удзельніц дакладаў і інфармацыі. Такія прапановы і агульныя рэкамендацыі ўключаюцца ў справаздачу Камітэта разам з каментарамі (калі такія ёсць) дзяржаў-удзельніц.

Артыкул 40. Канферэнцыя дзяржаў-удзельніц

1. Дзяржавы-ўдзельніцы рэгулярна сустракаюцца на Канферэнцыі дзяржаў-удзельніц для разгляду любога пытання, якое тычыцца ажыццяўлення гэтай Канвенцыі.

2. Не пазней чым праз шэсць месяцаў пасля ўваходжання гэтай Канвенцыі ў сілу Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый склікае Канферэнцыю дзяржаў-удзельніц. Наступныя нарады склікаюцца Генеральным сакратаром раз у два гады альбо па рашэнні Канферэнцыі дзяржаў-удзельніц.

Артыкул 41. Дэпазітарый

Дэпазітарыем гэтай Канвенцыі з'яўляецца Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Артыкул 42. Падпісанне

Дадзеная Канвенцыя адкрыта для падпісання ўсімі дзяржавамі і арганізацыямі рэгіянальнай інтэграцыі ў Цэнтральных установах Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Нью-Ёрку з 30 сакавіка 2007 года.

Артыкул 43. Згода на абавязковасць

Дадзеная Канвенцыя падлягае ратыфікацыі дзяржавамі, якія яе падпісалі, і афіцыйнаму пацвярджэнню арганізацыямі рэгіянальнай інтэграцыі, якія яе падпісалі. Яна адкрыта для далучэння да яе любой дзяржавы ці арганізацыі рэгіянальнай інтэграцыі, якія не падпісалі гэтую Канвенцыю.

Артыкул 44. Арганізацыі рэгіянальнай інтэграцыі

1. «Арганізацыя рэгіянальнай інтэграцыі» азначае арганізацыю, створаную суверэннымі дзяржавамі пэўнага рэгіёну, якой яе дзяржавы-ўдзельніцы перадалі кампетэнцыю ў дачыненні да пытанняў, якія рэгулююцца гэтай Канвенцыяй. Такія арганізацыі паказваюць у сваіх дакументах аб афіцыйным пацвярджэнні або далучэнні аб'ём сваёй кампетэнцыі ў дачыненні да пытанняў, якія рэгулююцца гэтай Канвенцыяй. Пасля

яны інфармуюць дэпазітарыя аб любых істотных зменах у аб'ёме іх кампетэнцыі.

2. Спасылкі ў гэтай Канвенцыі на «дзяржавы-ўдзельніцы» датычацца такіх арганізацый у межах іх кампетэнцыі.

3. Для мэтаў пункта 1 артыкула 45 і пунктаў 2 і 3 артыкула 47 гэтай Канвенцыі ні адзін дакумент, здадзены на захоўванне арганізацыяй рэгіянальнай інтэграцыі, не залічваецца.

4. Па пытаннях, якія адносяцца да іх кампетэнцыі, арганізацыі рэгіянальнай інтэграцыі могуць ажыццяўляць сваё права голасу на Канферэнцыі дзяржаў-удзельніц з колькасцю галасоў, роўнай колькасці іх дзяржаў-удзельніц, якія з'яўляюцца ўдзельніцамі гэтай Канвенцыі. Такая арганізацыя не ажыццяўляе свайго права голасу, калі такое права ажыццяўляе якая-небудзь з яе дзяржаў-удзельніц, і наадварот.

Артыкул 45. Уваходжанне ў сілу

1. Дадзеная Канвенцыя ўваходзіць у сілу на трыццаты дзень пасля здачы на захоўванне дваццатай ратыфікацыйнай граматы альбо дакумента аб далучэнні.

2. Для кожнай дзяржавы ці арганізацыі рэгіянальнай інтэграцыі, якая ратыфікуе гэтую Канвенцыю, афіцыйна пацвярджае яе альбо далучаецца да яе пасля здачы на захоўванне дваццатага такога дакумента, Канвенцыя ўваходзіць у сілу на трыццаты дзень пасля здачы імі на захоўванне свайго такога дакумента.

Артыкул 46. Агаворкі

1. Агаворкі, не сумяшчальныя з аб'ектам і мэтай гэтай Канвенцыі, не дапускаюцца.

2. Агаворкі могуць быць у любы час знятыя.

Артыкул 47. Папраўкі

1. Любая дзяржава-ўдзельніца можа прапанаваць папраўку да гэтай Канвенцыі і прадставіць яе Генеральнаму сакратару Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Генеральны сакратар паведамляе дзяржавам-ўдзельніцам аб любых прапанаваных папраўках і просіць інфармаваць яго, ці выступаюць яны за правядзенне канферэнцыі дзяржаў-удзельніц для разгляду гэтых прапаноў і прыняцця па ім рашэнняў. У выпадку, калі на працягу чатырох месяцаў з даты такога паведамлення не менш за траціну дзяржаў-удзельніц выступяць за правядзен-

не такой канферэнцыі, Генеральны сакратар склікае канферэнцыю пад эгідай Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Любая папраўка, ухваленая большасцю ў дзве траціны дзяржаў-удзельніц, якія прысутнічаюць і ўдзельнічаюць у галасаванні, накіроўваецца Генеральным сакратаром для зацвярджэння Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, а затым усім дзяржавам-удзельніцам для прыняцця.

2. Папраўка, ухваленая і зацверджаная ў адпаведнасці з пунктам 1 гэтага артыкула, набывае моц на трыццаты дзень пасля таго, як колькасць здадзеных на захоўванне дакументаў аб прыняцці дасягне дзве траціны ад колькасці дзяржаў-удзельніц на дату ўхвалення такой папраўкі. У далейшым папраўка ўваходзіць у сілу для любой дзяржавы-ўдзельніцы на трыццаты дзень пасля таго, як яна здала на захоўванне свой дакумент аб прыняцці. Папраўка з'яўляецца абавязковай толькі для тых дзяржаў-удзельніц, якія яе прынялі.

3. Калі Канферэнцыя дзяржаў-удзельніц прыме кансэнсусам адпаведнае рашэнне, ухваленая і зацверджаная ў адпаведнасці з пунктам 1 гэтага артыкула папраўка, якая адносіцца выключна да артыкулаў

34, 38, 39 і 40, уваходзіць у сілу для ўсіх дзяржаў-удзельніц на трыццаты дзень пасля таго, як колькасць дакументаў аб прыняцці, здадзеных на захоўванне, дасягне дзве траціны ад колькасці дзяржаў-удзельніц на дату ўхвалення такой папраўкі.

Артыкул 48. Дэнансацыя

Дзяржава-ўдзельніца можа дэнансаваць гэтую Канвенцыю шляхам накіравання пісьмовага паведамлення Генеральнаму сакратару Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Дэнансацыя ўступае ў сілу праз год пасля даты атрымання Генеральным сакратаром такога паведамлення.

Артыкул 49. Даступны фармат

Павінна быць забяспечана наяўнасць тэксту дадзенай Канвенцыі ў даступных фарматах.

Артыкул 50. Аўтэнтычныя тэксты

Тэксты гэтай Канвенцыі на англійскай, арабскай, іспанскай, кітайскай, рускай і французскай мовах з'яўляюцца роўнааўтэнтычнымі.

У СВЕДЧАННЕ ГЭТАГА ніжэйпадпісаныя паўнамоцныя прадстаўнікі, належным чынам на тое ўпаўнаважаныя сваімі адпаведнымі ўрадамі, падпісалі гэтую Канвенцыю.

Факультатыўны пратакол да Канвенцыі аб правах людзей з інваліднасцю

Дзяржавы – ўдзельніцы гэтага Пратакола пагадзіліся аб наступным:

Артыкул 1

1. Дзяржава-ўдзельніца гэтага Пратакола («дзяржава-ўдзельніца») прызнае кампетэнцыю Камітэта па правах людзей з інваліднасцю («Камітэт») прымаць і разглядаць паведамленні ад ці ад імя асоб або груп асоб, якія знаходзяцца пад яе юрысдыкцыяй і заяўляюць, што з'яўляюцца ахвярамі парушэння палажэнняў Канвенцыі гэтай дзяржавай-удзельніцай.

2. Паведамленне не прымаецца Камітэтам, калі яно тычыцца дзяржавы-ўдзельніцы Канвенцыі, якая не з'яўляецца ўдзельніцай гэтага Пратакола.

Артыкул 2

Камітэт лічыць паведамленне непрымальным, калі:

а) паведамленне з'яўляецца ананімным;

b) паведамленне ўяўляе сабой злоўжыванне правам на падачу такіх паведамленняў або несумяшчальна з палажэннямі Канвенцыі;

c) тое ж пытанне ўжо разглядалася Камітэтам альбо было разгледжана ці разглядаецца ў рамках іншай працэдуры міжнароднага разбіральніцтва або ўрэгулявання;

d) вычарпаныя не ўсе наяўныя ўнутраныя сродкі абароны. Гэта правіла не ўжываецца, калі прымяненне сродкаў абароны неапраўдана зацягваецца або наўрад ці прынясе дзейсны эфект;

e) яно з'яўляецца відавочна неабгрунтаваным або недастаткова аргументаваным альбо

f) факты, якія з'яўляюцца прадметам паведамлення, мелі месца да ўступлення гэтага Пратакола ў сілу для адпаведнай дзяржавы-ўдзельніцы, калі толькі гэтыя факты не працягваліся і пасля згаданай даты.

Артыкул 3

З улікам палажэнняў артыкула 2 гэтага Пратакола Камітэт у канфідэнцыйным парадку інфармуе дзяржаву-ўдзельніцу аб любых прадстаўленых яму паведамленнях. На працягу шасці месяцаў дзяржа-

ва, якая атрымала такую інфармацыю, прадстаўляе Камітэту пісьмовыя тлумачэнні або заявы з удакладненнем пытання альбо сродка абароны (калі такое існуе), якое, магчыма, было ўжыта гэтай дзяржавай.

Артыкул 4

1. У любы момант паміж атрыманнем паведамлення і вынясеннем пастановы па сутнасці Камітэт можа накіраваць адпаведнай дзяржаве-ўдзельніцы для неадкладнага разгляду просьбу аб прыняцці гэтай дзяржавай-удзельніцай такіх часовых мер, якія могуць быць неабходныя для таго, каб пазбегнуць нанясення магчымай непапраўнай шкоды ахвяры альбо ахвярам меркаванага парушэння .

2. Калі Камітэт ажыццяўляе сваё дыскрэцыйнае права ў адпаведнасці з пунктам 1 гэтага артыкула, гэта не азначае, што ён прыняў рашэнне адносна прымальнасці альбо па сутнасці паведамлення.

Артыкул 5

Пры разглядзе паведамленняў у адпаведнасці з гэтым Пратаколам Камітэт праводзіць закрытыя

пасяджэнні. Пасля разгляду паведамлення Камітэт накіроўвае свае прапановы і рэкамендацыі (калі такія маюцца) адпаведнай дзяржаве-ўдзельніцы і заяўніку.

Артыкул 6

1. Калі Камітэт атрымлівае дакладную інфармацыю, якая сведчыць аб сур'ёзных ці сістэматычных парушэннях дзяржавай-удзельніцай правоў, замацаваных у Канвенцыі, ён прапануе гэтай дзяржаве-ўдзельніцы супрацоўнічаць у вывучэнні гэтай інфармацыі і з гэтай мэтай падаць заўвагі датычна адпаведнай інфармацыі.

2. З улікам любых заўваг, якія могуць быць прадстаўлены адпаведнай дзяржавай-удзельніцай, а таксама любой іншай дакладнай інфармацы, якой валодае Камітэт, ён можа даручыць аднаму або некалькім сваім членам правесці расследаванне і тэрмінова прадставіць даклад Камітэту. У тых выпадках, калі гэта апраўдана, і са згоды дзяржавы-ўдзельніцы расследаванне можа ўключаць наведванне яе тэрыторыі.

3. Пасля вывучэння вынікаў такога расследавання Камітэт накіроўвае гэтыя вынікі адпаведнай дзяржаве-ўдзельніцы разам з любымі каментарамі і рэкамендацыямі.

4. На працягу шасці месяцаў з моманту атрымання вынікаў, каментараў і рэкамендацый, накіраваных Камітэтам, дзяржава-ўдзельніца прадстаўляе яму свае заўвагі.

5. Такое расследаванне праводзіцца ў канфідэнцыйным парадку, і на ўсіх этапах працэсу прадугледжваецца зварот да дзяржавы-ўдзельніцы за супрацоўніцтвам.

Артыкул 7

1. Камітэт можа прапанаваць адпаведнай дзяржаве-ўдзельніцы ўключыць у свой даклад, прадугледжаны артыкулам 35 Канвенцыі, звесткі аб любых мерах, прынятых у адказ на расследаванне, праведзенае згодна з артыкулам 6 гэтага Пратакола.

2. Пры неабходнасці Камітэт можа па сканчэнні шасцімесячнага тэрміна, аб якім гаворыцца ў пункце 4 артыкула 6, прапанаваць адпаведнай дзяржаве-ўдзельніцы інфармаваць яго аб мерах, прынятых у адказ на такое расследаванне.

Артыкул 8

Кожная дзяржава-ўдзельніца можа ў момант падпісання гэтага Пратакола, яго ратыфікацыі або далу-

чэння да яго заявіць, што не прызнае кампетэнцыю Камітэта, прадугледжаную ў артыкулах 6 і 7.

Артыкул 9

Дэпазітарыем гэтага Пратакола з'яўляецца Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Артыкул 10

Гэты Пратакол адкрыты для падпісання дзяржавамі і арганізацыямі рэгіянальнай інтэграцыі, якія падпісалі Канвенцыю, у Цэнтральных установах Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Нью-Ёрку з 30 сакавіка 2007 года.

Артыкул 11

Гэты Пратакол падлягае ратыфікацыі дзяржавамі, якія яго падпісалі, і ратыфікавалі Канвенцыю або далучыліся да яе. Ён падлягае афіцыйнаму пацвярджэнню арганізацыямі рэгіянальнай інтэграцыі, якія падпісалі яго, і афіцыйна пацвердзілі Канвенцыю або далучыліся да яе. Ён адкрыты для далучэння да яго любой дзяржавы ці арганізацыі рэгіянальнай інтэграцыі, якія ратыфікавалі Канвенцыю, афіцыйна пацвердзілі

яе альбо далучыліся да яе і якія не падпісалі гэты Пратакол.

Артыкул 12

1. «Арганізацыя рэгіянальнай інтэграцыі» азначае арганізацыю, створаную суверэннымі дзяржавамі пэўнага рэгіёну, якой яе дзяржавы-ўдзельніцы перадалі кампетэнцыю ў дачыненні да пытанняў, якія рэгулююцца Канвенцыяй і гэтым Пратаколам. Такія арганізацыі паказваюць у сваіх дакументах аб афіцыйным пацвярджэнні або далучэнні аб'ём сваёй кампетэнцыі ў дачыненні да пытанняў, якія рэгулююцца Канвенцыяй і гэтым Пратаколам. Пасля яны інфармуюць дэпазітарыя аб любых істотных зменах у аб'ёме іх кампетэнцыі.

2. Спасылкі ў гэтым Пратаколе на «дзяржавы-ўдзельніцы» датычацца такіх арганізацый у межах іх кампетэнцыі.

3. Для мэтаў пункта 1 артыкула 13 і пункта 2 артыкула 15 гэтага Пратакола ні адзін дакумент, здадзены на захоўванне арганізацыяй рэгіянальнай інтэграцыі, не залічваецца.

4. Па пытаннях, якія адносяцца да іх кампетэнцыі, арганізацыі рэгіянальнай інтэграцыі могуць ажыц-

цяўляць сваё права голасу на нарадзе дзяржаў-удзельніц з колькасцю галасоў, роўнай колькасці іх дзяржаў-удзельніц, якія з'яўляюцца ўдзельніцамі гэтага Пратакола. Такая арганізацыя не ажыццяўляе свайго права голасу, калі такое права ажыццяўляе якая-небудзь з яе дзяржаў-удзельніц, і наадварот.

Артыкул 13

1. Пры ўмове ўступлення Канвенцыі ў сілу гэты Пратакол набывае моц на трыццаты дзень пасля здачы на захоўванне дзесятай ратыфікацыйнай граматы альбо дакумента аб далучэнні.

2. Для кожнай дзяржавы ці арганізацыі рэгіянальнай інтэграцыі, якая ратыфікуе гэты Пратакол, афіцыйна пацвярджае яго далучаецца да яго пасля здачы на захоўванне дзесятага такога дакумента, Пратакол набывае моц на трыццаты дзень пасля здачы імі на захоўванне свайго такога дакумента.

Артыкул 14

1. Агаворкі, не сумяшчальныя з аб'ектам і мэтай гэтага Пратакола, не дапускаюцца.

2. Агаворкі могуць быць у любы час знятыя.

Артыкул 15

1. Любая дзяржава-ўдзельніца можа прапанаваць папраўку да гэтага Пратакола і прадставіць яе Генеральнаму сакратару Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Генеральны сакратар паведамляе дзяржавам-удзельніцам аб любых прапанаваных папраўках і просіць інфармаваць яго, ці выступаюць яны за правядзенне нарады дзяржаў-удзельніц для разгляду гэтых прапаноў і прыняцця па ім рашэнняў. У выпадку, калі на працягу чатырох месяцаў з даты такога паведамлення не менш за траціну дзяржаў-удзельніц выступяць за правядзенне такой нарады, Генеральны сакратар склікае нараду пад эгідай Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Любая папраўка, ухваленая большасцю ў дзве траціны дзяржаў-удзельніц, якія прысутнічалі і ўдзельнічалі ў галасаванні, накіроўваецца Генеральным сакратаром для зацвярджэння Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, а затым усім дзяржавам-удзельніцам для прыняцця.

2. Папраўка, ухваленая і зацверджаная ў адпаведнасці з пунктам 1 гэтага артыкула, набывае моц на трыццаты дзень пасля таго, як колькасць здадзеных на захоўванне дакументаў аб прыняцці дасягне

дзве траціны ад колькасці дзяржаў-удзельніц на дату ўхвалення такой папраўкі. У далейшым папраўка ўваходзіць у сілу для любой дзяржавы-ўдзельніцы на трыццаты дзень пасля таго, як яна здала на захоўванне свой дакумент аб прыняцці. Папраўка з'яўляецца абавязковай толькі для тых дзяржаў-удзельніц, якія яе прынялі.

Артыкул 16

Дзяржава-ўдзельніца можа дэнансаваць гэты Пратакол шляхам накіравання пісьмовага паведамлення Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Дэнансацыя ўступае ў сілу праз год пасля даты атрымання Генеральным сакратаром такога паведамлення.

Артыкул 17

Павінна быць забяспечана наяўнасць тэксту гэтага Пратакола ў даступных фарматах.

Артыкул 18

Тэксты гэтага Пратакола на англійскай, арабскай, іспанскай, кітайскай, рускай і французскай мовах з'яўляюцца роўнааўтэнтычнымі.

У СВЕДЧАННЕ ГЭТАГА ніжэйпадпісаныя паўнамоцныя прадстаўнікі, належным чынам на тое ўпаўнаважаныя сваімі адпаведнымі урадамі, падпісалі гэты Пратакол.